Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА ЛКСМБ І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА імя У. І. ЛЕНІНА

№ 27 (536) Субота, 28 верасня 1963 г. Цана 1 кап. Год выдання XVI-ы

# ЦЕЛИНА, ЦЕЛИНА...

Слова **П. Молофеева.**
Музыка **Л. Домашевского.**

Уезжаю далеко
На целинные земли.
Вновь на стройки Отчизны
Кличет смелых страна.
Добрый день вам, просторы,
Приуральские степи
И тревожные ветры,
Целина, целина...

Над крутыми лесами
Наклоняется солнце.
Поднимается к небу
Белой лентой стена.
Нет надежней опоры
Руки верного друга.
Сердце дышит простором,
Целина, целина...

День окончен рабочий.
Верный спутник
влюбленных,
Покачнувшись, поплыла
Над поселком луна.
Над уснувшим Чаганом
Бродят легкие тени,
Бродят нежные песни, —
Целина, целина...

Замелькают вокзалы.
Будут снова дороги,
Только память навечно
Нашей песне верна.
И останется в сердце
Тихий шопот Чагана,
Комсомольские стройки —
Целина целина...

ПЕСНЯ гэтая нарадзілася там, на цаліне, у студэнцкім будаўнічым атрадзе БДУ імя У. І. Леніна. Напісалі яе **Леанід Дамашэўскі і Пётр Малафееў.** І выконвалі яе на ўрачыстым мітынгу, прысвечаным ад'езду першага эшалона студэнтаў-будаўнікоў з Уральска таксама студэнты БДУ **Леанід Дамашэўскі, Віктар Глазуноў, Кіра Ліпская.**

Не кожнай песне выпадае такі гонар, не кожную песню сустракаюць так цёпла, радасна, шчыра. Гэтая ж песня адразу палюбілася ўсім, як можа толькі палюбіцца песня, напісаная аб цаліне, на цаліне, цалиннікамі. І пад перастук колаў вагона, я ведаю, кожны напяваў яе, думаючы аб цаліне ў поездзе, што імчаў на захад, у Мінск.

«Мы яшчэ вернемся да цябе, цаліна», — было на сэрцы ў кожнага юнака, у кожнай дзяўчыны.

У святочны дзень няёмка гаварыць аб дрэнным. Крыху не падлічылі кіраўнікі Уральшчыны магчымасцей студэнтаў-будаўнікоў, не падрыхтавалі патрэбнай колькасці будаўнічых матэрыялаў. Вось што пісалі цалиннікі ў сваіх пісьмах ва універсітэт у пачатку сваёй работы на ўсходніх будоўлях:

Канстанцін СУЧКОЎ:

**«Сустрэлі нас у асноўным нядрэнна. Але мясцовыя кіраўнікі крыху не падразлічылі нашых магчымасцей. Яны думалі — прыедуць, маўляў, прагуляцца. А прыехалі мы працаваць. І будматэрыялаў не хапае.**

**Я нядаўна вярнуўся з Томска. Ездзіў за лесам і прывёз гэты злашчасны лес...**

**Працуюць людзі добра. Нават вочы не вераць: глядзіш, а перад табой стаіць буданіна, пабудаваная не кімсьці, а студэнтамі. Як пасаромлены скептыкі!.. Днямі падлічылі заработкі ў саўгасе «Стэпавым». Атрымалі на брата па 100 рублёў за 18 дзён. Яшчэ адзін гол у вароты скептыкаў!**

**Уладкаваліся рабяты добра. Харчаванне выдатнае. Я толькі што гасцяваў у стэпнякоў. Уражанне выдатнае».**

**«У нас у асноўным усё ў парадку. Адна вялікая бяда — няма лесаматэрыялу. Няма і ўсё. Абяцаюць праз пару дзён падкінуць.**

**У нядзелю праводзілі сустрэчу чатырох атрадаў — двух універсітэцкіх і двух палітэхнікаў. Згулялі ў валейбол, футбол, паплавалі ў рэчцы. Хто-ніхто нават у адзенні — смеху было!..**

**27-VIII-63 г.»**

Васіль ЧУМАКОЎ:

**«Атрад працуе добра, але мог бы яшчэ лепш. Ахалоджваюць адносіны да нас нашага начальства. Справа ў тым, што начальнік БМУ прыязджае, абяцае, але мала чаго робіць... А мы гэтае БМУ «вывелі ў людзі». Нашай работай яно ўзнялося з перадапошняга месца на 1—2-е ў трэсце (па вобласці), а наш участак трымае першае месца ў маштабе ўпраўлення, г. зн. мы працуем лепш усіх студэнтаў, якія працуюць ад БМУ ў Зялёнаўскім упраўленні. На 15 е жніўня мы выканалі ўжо 60% плана...**

**На дзень будаўніка саўгас выдаў нам грашовую прэмію ў 100 рублёў. 2 чалавекі ўзнагароджаны граматамі сельскага абкома камсамола, 10—райкома камсамола...».**





# Будаўнічая сесія здадзена на „5"

«Я, шчыра кажучы, ніколі не спадзяваўся, **што студэнты** могуць так працаваць. Малайцы, рабяты! Вялікае вам дзякуй!» — гаварыў на развітальным мітынгу старшыня аднаго з калгасаў тав. Гайдаенка. Ды і многія кіраўнікі таксама не надта верылі ў сілу нашых студэнтаў. Але ўсім ім хутка прыйшлося прыемна расчаравацца. План будаўнічых работ быў выкананы, па папярэдніх падліках, на 130 працэнтаў усім беларускім будаўнічым атрадам.

Вярнуліся ў родную Беларусь студэнты. **«Мы усёй душой палюбілі гэтых цудоўных людзей,** — піша ў цалиннай шматтыражцы **«Строительный семестр»** сакратар Уральскага абкома ЛКСМ Казахстана Л. Валейка, — **якія па загаду сэрца, ахвяруючы сваім адпачынкам, прыехалі на дапамогу да нас. Яны пакінулі пасля сябе не толькі будынкі і кашары, але і агеньчыкі [illegible]самольскай дружбы, інтэрнацыялізма паміж брат[illegible]одамі Беларусі і Казахстана. Няма сумнення, што гэта дружба будзе моцнай і вечнай. Дзякуй вам за дапамогу, дарагія сябры!»...**

**В. НАЛІМАЎ**





Цалінныя фота чацвертакурсніка фізфака Тадэуша **ПЯРКОЎСКАГА**

Здымак 1. «Прыемнага апетыту», — так і хочацца сказаць тым, хто сядзіць за сталом у цалиннай сталоўцы. Фатографу нават цяжка было адарвацца ад лыжкі з талеркай, каб націснуць на кнопку сваёй неразлучнай «Змены».

Здымак 2. Калі вы пажадаеце зрабіць самую модную цалинную прычоску «перакаці-поле», звяртайцеся да студэнта 4 курса фізічнага факультэта Эдуарда Драба. Паглядзіце, як умела калдуе ён над шавялюрай свайго аднакурсніка Мікалая Сяргіені.

Здымак 3. Фатографу таксама прыйшлося залезці на дах, каб сфатаграфаваць Генадзія Гарэліка за працай.

Здымак 4. Хоць зараз у Генадзія Анціпава ў руках не цагліна, а вядро з раствором, не забывайцеся, што перад вамі адзін з лепшых будаўнікоў. Гена мае чацвёрты разрад муляра.

# Надзённая задача партыйнай арганізацыі

Адбыўся агульны сход партарганізацыі універсітэта. Абмяркоўваліся вынікі чэрвеньскага Пленума ЦК КПСС і задачы універсітэцкай партыйнай арганізацыі па ідэйна-палітычнаму, працоўнаму выхаванню і прафесіянальнай падрыхтоўцы студэнтаў. Змястоўны, глыбока аргументаваны даклад па гэтаму пытанню зрабіў прарэктар універсітэта па навуковай рабоце прафесар В. І. СЦЯПАНАЎ. Ізлажыўшы галоўныя палажэнні рашэнняў чэрвеньскага Пленума, дакладчык падрабязна спыніўся на пытаннях работы выкладчыцкіх кадраў, навуковай рабоце студэнцкіх гурткоў, рабоце мастацкай самадзейнасці, на пытаннях работы факультэцкіх партыйных і камсамольскіх арганізацый па высокаідэйнаму і працоўнаму выхаванню студэнцкай моладзі. Даклад прафесара Сцяпанава насіў дзелавы і крытычны характар. У яго абмеркаванні ўдзельнічалі многія камуністы.

Аб ідэйна-эстэтычным выхаванні студэнтаў, аб прывіцці ім любві да працы, як аб надзённай задачы партыйнай арганізацыі і выкладчыцкага калектыву універсітэта, гаварыў сакратар партбюро матэматычнага факультэта А. В. САМСОНАЎ. Ён расказаў, як партбюро і выкладчыкі факультэта арганізоўваюць выхаваўчую і культурна-асветніцкую работу на факультэце ў святле рашэнняў чэрвеньского Пленума ЦК КПСС, як дабіваюцца ўцягнення ў актыўную грамадскую работу ўсіх студэнтаў.

Намеснік дэкана гістарычнага факультэта па вячэрняму навучанню тав. С. Г. СКАБЦОЎ спыніўся на пытанні неабходнасці ўдзелу ўсіх выкладчыкаў у выхаваўчай рабоце са студэнтамі. На факультэце ў гэтым кірунку зроблена многае. Выкладчыкі арганізоўваюць і праводзяць са студэнтамі агляды гістарычных часопісаў, сустрэчы са старымі камуністамі, з дзеячамі мастацтва. Усё гэта садзейнічае ўцягненню студэнтаў-вячэрнікаў у актыўную грамадскую работу.

Вялікае значэнне ў ідэйным выхаванні студэнтаў мае выкладанне грамадскіх дысцыплін. Гэтаму пытанню прысвяціў сваё выступленне дацэнт кафедры палітычнай эканоміі Ц. А. БАЗЫЛЕЎ. Ен расказаў, як кафедра вучыць студэнтаў звязваць тэорыю з жыццём. З гэтымі мэтамі праводзяцца выезды ў калгасы, на прадпрыемствы, пашыраныя пасяджэнні кафедры з удзелам студэнтаў, на якіх выступаюць з дакладамі работнікі сельскай гаспадаркі і прамысловасці. Члены кафедры арганізавалі работу некалькіх навуковых гурткоў па палітычнай эканоміі на юрыдычным і гістарычным факультэтах. У мінулым навучальным годзе сем студэнцкіх навуковых работ былі прадстаўлены на рэспубліканскі агляд.

Студэнт 3 курса юрыдычнага факультэта ГЛЕБАЎ гаварыў, што для ўзняцця ўзроўню ідэйна-палітычнай работы на факультэце неабходна палепшыць умовы вучобы і быту студэнтаў.

Старшыня мясцкома дацэнт Ц. Е. САЛАДКОЎ у сваім выступленні звярнуў увагу камуністаў на неабходнасць выхавання ў студэнтаў беражлівых адносін да грамадскай маёмасці, высокай дысцыпліны, добрасумленнасці. Неабходна арганізаваць ва універсітэце рух за камуністычную працу, за захаванне маральнага кодекса будаўніка камунізма.

Пытанням працоўнага выхавання прысвяціў свае выступленне сакратар камітэта камсамола універсітэта Г. Я. РЫЛЮК.

Як удзельнік чэрвеньскага Пленума ЦК КПСС, рэктар універсітэта акадэмік А. Н. СЕЎЧАНКА расказаў аб ходзе работы Пленума і спыніўся на задачах, якія паставіла партыя перад работнікамі вышэйшай школы.

Сакратар партыйнага бюро філалагічнага факультэта А. А. ВОЛК у сваім выступленні падкрэсліў, што да гэтага часу на факультэце занадта многа ўвагі адводзілі агульным мерапрыемствам, мала работалі з асобнымі студэнтамі. Улічваючы гэта, партбюро і дэканат факультэта перабудоўваюць сваю работу з тым, каб дайсці да кожнай акадэмічнай групы, да кожнага студэнта.

Па абмеркаванаму пытанню агульны партыйны сход універсітэта прыняў разгорнутае рашэнне.



На здымку: адзін з корпусоў новага універсітэцкага інтэрната па вуліцы Кастрычніцкай.

Фота студэнта Яўгена КАРПІНЧЫКА

## Універсітэт за тыдзень

Дзве тысячы студэнтаў нашага універсітэта ў пачатку тыдня выехалі ў калгасы і саўгасы Міншчыны, каб дапамагчы ім у правядзенні асенніх сельскагаспадарчых работ.

Днямі адбыўся агульны партыйны сход БДУ, які абмеркаваў пытанні ідэалагічнай работы. Справаздачу аб гэтым сходзе мы друкуем у сённяшнім нумары.

З 22 па 29 верасня ў Беларусі праводзіцца тыдзень літоўскай кнігі. У панядзелак наш універсітэт наведала група літоўскіх пісьменнікаў, якая госціць зараз у нашай рэспубліцы.

# Справаздача студэнцкага лета

Чэрвеньскі Пленум Цэнтральнага Камітэта Камуністычнай партыі Савецкага Саюза, прысвечаны ідэалагічным пытанням, з'явіўся сапраўдным гімнам працы, той самай працы, што золатам упісана ў вялікую Праграму нашай партыі. Аснову ідэалагічнай работы ўсіх камсамольскіх арганізацый вышэйшых навучальных устаноў павінна складаць выхаванне ў кожнага савецкага студэнта любві і павагі да фізічнай працы.

Яшчэ задаўга да летніх канікул камітэт камсамола нашага універсітэта на адным з пасяджэнняў зацвердзіў спецыяльны штаб працы і адпачынку студэнтаў у час летніх канікул. Штаб складаўся з чатырох секцый. Адна з іх, потым стаўшая цалінным штабам, займалася пытаннямі падрыхтоўкі студэнцкага будаўнічага атрада БДУ імя У. І. Леніна да ад'езду на цаліну. Другая секцыя займалася ўкамплектаваннем і падрыхтоўкай студэнтаў для будаўніцтва нашага універсітэцкага стадыёна, які пачалі будаваць на грамадскіх пачатках сёлета, і для будаўніцтва студэнцкіх інтэрнатаў на вуліцы Кастрычніцкай. Трэцяя секцыя, улічваючы вопыт мінулага года, аказвала дапамогу студэнтам у паездцы ў спецыялізаваныя саўгасы і калгасы Крымскай вобласці. Чацвёртая займалася толькі арганізацыяй адпачынку, г. зн. укамплектаваннем спартыўна-аздараўленчага лагера «Нарач», арганізацыяй экскурсій, пасылкай студэнтаў у дамы адпачынку, арганізацыяй турысцкіх паходаў па дарогах Каўказа, Карпат, Крыма і Паміра.

Студэнтам нашага універсітэта выпала вялікае шчасце сёлета ўдзельнічаць у паездцы ў складзе студэнцкага будаўнічага атрада Беларусі на будоўлі ва Уральскую вобласць Заходне-Казахстанскага краю. 290 пасланцаў Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна працавалі ў саўгасах Зялёнаўскага тэрытарыяльнага вытворчага упраўлення Уральскай вобласці. На некалькі тыдняў будучыя фізікі, матэматыкі, журналісты, юрысты, хімікі, гісторыкі сталі будаўнікамі.

Па рашэнню камітэта камсамола БДУ кожны студэнт універсітэта ўлетку павінен быў адпрацаваць не менш як па працоўнаму тыдню. 1000 студэнтаў па 6 дзён г. зн. 42 тысячы гадзін выпрацавана ў час летніх канікул на будаўніцтве стадыёна. Гэта вялікая работа. Нават у верасні па 70 чалавек працуюць штодзённа з 15 гадзін 30 мінут. Да пачатку зімы ўсе грунтавыя работы будуць закончаны. Скора ў нашых студэнтаў будзе свой стадыён. Нават двойчы студэнцкі, бо будуецца ён для студэнтаў і будуюць яго студэнты.

400 студэнтаў універсітэта два тыдні, з 1 па 14 ліпеня, працавалі на будаўніцтве інтэрната, такім чынам, паскорылі ўвядзенне яго ў эксплуатацыю.

Летась адна з груп хімічнага факультэта працавала ў Сімферопальскім раёне Крымскай вобласці. Гэтае пачынанне падхапілі студэнты ўсіх факультэтаў нашага універсітэта. У мінулым годзе іх было толькі 26. Камсамольская арганізацыя БДУ імя У. І. Леніна атрымала гарачыя словы ўдзячнасці за добрую працу гэтых 26 энтузіястаў. Сёлета студэнтаў універсітэта ў калгасах і саўгасах Крымскай вобласці было 170. Сустракаў студэнтаў сёлета не толькі Сімферопальскі раён, але і Севастопальскі, Алэскі, Бахчысарайскі. У крымскія спецыялізаваныя саўгасы сёлета выязджалі не толькі хімікі, але і філолагі, географы, біёлагі, юрысты, матэматыкі. Усе яны працавалі цэлы месяц. Праз рукі дзяўчат і юнакоў прайшлі сотні тон збожжа. Яны прапалолі дзесяткі гектараў кукурузы, працавалі на вінаградных і тытунёвых палетках. Пасля працоўнага месяца нашы студэнты зрабілі цікавыя і захапляючыя падарожжы па Крымскаму паўвостраву, наведаўшы Феадосію, Бахчысарай, Севастопаль і іншыя гарады старажытнай Таўрыды.

Цікава селета быў арганізаваны і адпачынак нашых студэнтаў. Трыста чалавек адпачывалі ў спартыўна-аздараўленчым лагеры на возеры Нарач. 108 студэнтаў пабывалі на экскурсіях у Ленінградзе, на Барадзінскім поле, у сяле Міхайлаўскім, у Рызе, у Яснай Паляне, у Маскве. Больш 100 чалавек зрабілі турысцкі паход па дарогах Крыма і Каўказа. А 22 чалавекі пакаралі вяршыні Паміра, Каўказа, Карпат. 54 студэнты адпачывалі ў дамах адпачынку Беларускай і Літоўскай ССР, а таксама на поўдні краіны.

220 студэнтаў універсітэта на працягу ўсяго лета працавалі ў розных піянерскіх лагерах рэспублікі.

Па рашэнню ЦК ЛКСМБ канцэртная брыгада нашага універсітэта ў саставе 15 чалавек выязджала ва Уральскую вобласць Заходне-Казахстанскага краю, дзе дала за месяц 38 канцэртаў.

Георгій РЫЛЮК,

сакратар камітэта камсамола БДУ імя У. І. Леніна

## Вершы універсітэцкіх паэтаў

### ДОЖДЬ

Дождь шагает, как рабочий,
Пыль лопатою гребёт,
Грома молотом грохочет
И из солнца хлеб куёт.
Вон за речкой, за туманом,
Сделал радуги дугу,
Ухватил подъёмным краном
И поставил на лугу.
И на пашни он прошёлся,
Лемеха все так отмыл,
Что проглянувшее солнце,
Словно зеркалом, затмил.
Хорошо дождище льётся.
Так и мне бы молотить,
Чтоб в сверкающее солнце
Всю планету превратить!

Александр ПОПЕЛЬ,
художник Белорусского автозавода, выпускник заочного отд. журналистики.

* * *

Пусть всё останется, как было:
Молчанье, робкие слова...
И телефонная кабина,
И мы, сошедшие с ума,
Когда пугаешься вопросов,
Ответы ищешь второпях
И трубка чёрной папиросой
Дрожит и колется в руках.
Она совсем не виновата,
Что нам не первым, не вторым,
Потрескивая суховато,
Пускает слов чадящий дым...
Пусть всё останется, как было,
На предусмотренных местах:
Ночь... Телефонная кабина,
И мы на разных полюсах...

Юрий САПОЖКОВ,
студент 2 курса отделения журналистики.

Рэдактар У. КУЛАЖАНКА

*Падпісвайцеся на штомесячны ілюстраваны навукова-папулярны атэістычны часопіс*

**«НАУКА И РЕЛИГИЯ»**

Часопіс публікуе артыкулы, нарысы і рэпартажы аб навейшых дасягненнях савецкай і зарубежнай навукі: астраноміі, фізікі, хіміі, біялогіі, медыцыны і г. д.; змяшчае разнастайныя матэрыялы, прысвечаныя пытанням крытыкі рэлігійнай ідэалогіі і перадольвання рэлігійных перажыткаў; асвятляе вопыт і методыку навукова-атэістычнай прапаганды, формы і метады антырэлігійнай работы; знаёміць з развіццём навукова-атэістычнай думкі ў нашай краіне і за рубяжом; рэцэнзіруе навінкі атэістычнай навуковай і мастацкай літаратуры, новыя фільмы і спектаклі; дае кансультацыі па пытаннях савецкага заканадаўства аб рэлігійных культах; рэгулярна друкуе апавесці, апавяданні, нарысы, фельетоны, вершы — лепшыя творы айчыннай і сусветнай літаратуры на атэістычныя тэмы.

Часопіс уяўляе цікавасць для людзей самых разнастайных прафесій — рабочых, інжынераў і тэхнікаў, настаўнікаў, урачоў, работнікаў культурна-асветніцкіх устаноў і іншых. Лектары, прапагандысты і агітатары, слухачы гурткоў і семінараў па пытаннях навуковага атэізма могуць выкарыстаць матэрыялы часопіса для сваіх выступленняў, гутарак, для падрыхтоўкі і правядзення заняткаў. Часопіс мае важнае значэнне для атэістаў, якія вядуць індывідуальную работу з веруючымі, а большасць матэрыялаў, публікуемых у часопісе, звернута непасрэдна да саміх веруючых.

Кошт падпіскі на часопіс: на год — 3 руб. 60 кап., на 6 месяцаў — 1 руб. 80 кап. Кошт асобнага нумара — 30 кап.

Адрас рэдакцыі: Мінск, Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, 212. Тэл. 2-07-19.

Друкарня Белсаўпрофа.
АТ 10490 Тыр. 2000. Зак. 3466